# ПРАЗ КНІГУ ДА ДАБРЫНІ

**9 лютага вучні 4 «а» класа СШ № 7 прыйшлі ў гарадскую бібліятэку № 7 на сустрэчу з вядомай на Гродзеншчыне і ў рэспубліцы беларускай паэтэсай, празаікам, аўтарам дзіцячых апавяданняў і вершаў Л.А.Кебіч. У ходзе мерапрыемства юныя аматары чытання знаёміліся з навінкамі дзіцячай літаратуры, слухалі апавяданні з новай кніжкі Людмілы Антонаўны, адгадвалі загадкі.**

Творчасць знанай беларускай пісьменніцы, нашай зямлячкі напоўнена любоўю да людзей і да жыцця; яе слова вучыць быць уважлівымі да кожнага імгнення, праведзенага чалавекам у свеце людзей, адлюстроўвае рэчаіснасць у светлых, яркіх танах, выклікае імкненне берагчы і памнажаць тую дабрыню, душэўную цеплыню, што закладзены ў кожным з нас.

І дзеці, і настаўнікі выказвалі падзяку бібліятэкарам за арганізацыю цікавай сустрэчы. У канцы Людміла Антонаўна Кебіч падарыла сваю новую кніжку бібліятэцы. На памяць засталося сумеснае фота пісьменніцы са школьнікамі.

**centrbibl.grodno.by**
**прэс-служба СПБ-ГРОДНА**

***На фота:*** сустрэча вядомай беларускай пісьменніцы Л.А.Кебіч з вучнямі 4 «а» класа СШ № 7 г. Гродна. Гарадска бібліятэка № 7. 9 лютага 2018 года.






Энцыклапедыі
Слоўнікі, даведнікі